Праваслаўны малітаўнік

Праваслаўны малітаўнік

Выдадзена з добраслауленьня
Архіяпіскапа
Беластоцка - Гданьскага
САВЫ

Беласток 1990

АБ МАЛІТВЕ

МАЛІТВА – нашае духовае задзіночаньне з Богам. Гэта нашая, любая Яму, размова зь Ім. Таму, прыступаючы да малітвы, мы падымаем вочы да Айца нашага Нябеснага. У духу просім выбачэньня ў тых, каму мы якую крыўду ўчынілі, адначасна самі выбачаем усім тым, што нас у нечым пакрыўдзілі. Толькі ў такім пагадненьні з усімі, можам быць годнымі размовы із Богам, крыніцаю любові, ласкі, міласэрдзя й выбачэньня. Толькі так мы можам ськіваваць думкі свае да Яго, ды мець надзею, што Ён выслухае нас, прыйме малітвы нашыя.

Сам Ісус Хрыстос сказаў:" Прасеце, і будзе дадзена вам" /Мц.7,7/. Іншым разам сказаў:" І ўсё, чаго будзеце прасіць у малітве зь вераю, атрымаеце" /Мц.21,22/. Прыступаючы да малітвы, трэба цьвёрда ВЕРЫЦЬ, што Сын Божы задаволіць добрую просьбу нашую ў належны час, бо Ён лепш ве-

дае, што й калі патрэбнае для жыцьця, дабра й спасеньня нашага.

Таму ў малітве мае быць наш поўны ДАВЕР да Бога, вялікая НАДЗЕЯ на ласку Ягоную, ды нашая ЛЮБОЎ да Яго, адначасна належнае зразуменьне нашых грахоў і правінаў, злучанае з ПАКОРАЮ Мытніка, якога Госпад Міласэрны апраўдаў ужо за словы: "Божа, будзь міласьцівы мне грэшнаму/Лк. 18, 13/.

Айцец і вучыцель Царквы, сьв. Ёан Залатавусны вучыць нас: Уважаю, што кажны чалавек добрае волі пагодзіцца са мною, без малітвы немагчыма весьці цнатлівае жыцьцё, ані належна закончыць яго. А сьв. Апостал Паўла заклікае: "Бязупынна малецеся" /І Фэс. 5, 17/.

Таму трэба маліцца: рана, ў дзень і вечарам, перад працаю й пасьля працы й ў часе працы, як гэта рабілі нашыя пабожныя продкі. Асабліва дні Сьвяточныя створаныя да малітвы. Мілым Богу месцам да яе ёсьць дом

Божы, царква.

За каго маем маліцца? Наўперад за сябе самых. За сваіх родных: бацькоў, дзяцей, мужа ці жонку, братоў і сёстры. За сваіх айцоў духоўных, за настаўнікаў, прыяцеляў і знаёмых, за ўвесь наш народ Беларускі, за нашую маці-Беларусь, за край, у якім жывем. Бо сам Спас наш плакаў над доляй Ерусаліму й народу, сярод якога Ён радзіўся як чалавек. Сьв. Паўла кажа: "Браты! Жаданьне сэрца майго й малітва да Бога аб Ізраэлю на спасеньне"/Рым.10, 1/. А такжа за ўсіх людзей жывых і памершых: "Дык перш за ўсё прашу ўпрашаць, маліцца, ды дзякаваць за ўсіх людзей"/1 Цім. 2, 1/.

Каб малітва была запраўды мілая Богу, трэба старацца, каб ніхто не перашкаджаў падчас яе, а ўжо ніяк нельга выстаўляць яе на паказ, або выхваляцца ёю перад людзьмі. Сам Хрыстос часта маліўся. Тады Ён адыходзіў ад вучанікаў Сваіх. Гэтае самае Ён, Сын Божы, запаведаў і нам: "Ты-ж калі

молішся, ідзі ў камору сваю, і зачыніўшы дзьверы, памаліся Айцу Свайму ТАЙНА, а Ён узнагародзіць цябе ЯЎНА" /Мац. 6, 6/.

Подле зьместу малітвы ёсьць: ПАХВАЛЬНЫЯ, у якіх хвалім і славім Бога, Творцу і Спаса нашага, за бязьмежную любоў Ягоную да нас, за дасканаласьць і ўсемагутнасьць Ягоную. УДЗЯЧНЫЯ, у якіх чынім нашую падзяку Яму за ўсё: за сваё нараджэньне, за сваіх бацькоў, дзеці, мужа ці жонку, братоў і сёстры, за кожны добры ўчынак наш, бо ўсё гэта ласка Яго да нас. Малітвы з ПРОСЬБАМІ, у якіх просім Яго пасласць нам Сваё падтрыманьне, дапамогу ці пацеху. Малітва "Ойча Наш", сваім зьместам, абыймае ўсе гэтыя малітвы.

Подле хормы малітвы ёсьць: НУТРАНЫЯ, калі молімся Богу ў думках сваіх, не вымаўляючы словаў. Гэтыя малітвы выяўляюць пабожны стан нашых душаў. Сьв. ап. Паўла: "Дык, ці ясьце, ці п'яце, ці робіце, усё на славу Божую рабеце" /1 Кар. 10, 31/. У такім

стане прабывае кожны пабожны чалавек, і тое, што ён стала задзіночаны з Богам, лёгка пазнаць ужо зь віду ягонага.

ВОНКАВЫЯ малітвы, калі мы вымаўляем словы, хрысьцімся, кленчым. Тут найлепшым прыкладам нам ёсьць Сам Спас: калі Ён нічога не гаварыў, кожны бачыў, што ён дасканала задзіночаны з Айцом Нябесным, і Сам — выраз Боскасьці. Сьв. ап. Мацьвей так апавядае аб гэтым: "І, узыйшоўшы, Ён паў на аблічча Сваё, маліўся й казаў: "Ойча Мой! Калі магчыма, няхай абміне Чара гэтая Мяне, але не як Я хачу, а як хочаш Ты, няхай станецца" /Мц. 26, 39/.

Подле часу, малітвы ёсьць: РАНІЧНЫЯ, ДЗЁННЫЯ й ВЯЧЭРНІЯ. Подле каму - молімся да Айца нашага Нябеснага, Госпада нашага Ісуса Хрыста, да Прасьвятое Тройцы, да Бога Духа Сьвятога, да Прачыстае Маці Божае, да свайго Ангела Ахоўніка і да ўсіх Сьвятых, каб яны заступіліся за нас перад Богам.

Спас наш любіць усіх людзей. Грэшнікаў, калі яны з шчыраю малітваю зварочваюцца да Яго, просяць выбачэньня грахоў. Але асабліва Ён любіў і любіць дзяцей. Таму аднаго разу сказаў вучанікам Сваім: "Не перашкаджайце дзеткам прыходзіць да Мяне, бо такіх ёсьць Валадарства Нябеснае. І, абняўшы іх, усклаў на іх рукі Свае, і дабраславіў іх" /Мк. 19, 14-16/.

Таму трэба бязупынна маліцца, як запаведаў нам сьв. ап. Паўла: Малецеся ў радасьцях і пры ўсякіх посьпехах вашых, малецеся й у горы, бядзе, смутку й клопатах. Маліцца стала за сябе, і за іншых, і прасіць другіх маліцца за нас, бо: "Многа можа зрабіць малітва справядлівага" /Як. 5, 16/. "Няхай будзе хвалены Бог, Каторы малітвы маёй не адкінуў, і Ласкі Сваёй ня пазбавіў мяне /Пс. 66, 20/.

ВОКЛАДКА СЬВ. ЕВАНГЕЛЬЛЯ

РАНІЧНЫЯ МАЛІТВЫ

Як толькі рана ўстанеш, памыйся, адзенься ды шчыра памаліся Госпаду Богу перад абразамі:

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.*(тры разы хрысьцячыся)*

Божа, будзь міласьцівы мне грэшнаму(грэшнай)
(тры разы прыкладаючы кулак да грудзей)

Госпаду Ісусе Хрысьце, Сыне Божы, Спасе наш, дзеля малітваў Прачыстае Маці Твае, і ўсіх Сьвятых, памілуй нас. Амін.
(злажыўшы рукі)

Калі-б сталася, што зусім ня маеш часу, скажы яшчэ малітву Госпадаву "Ойча Наш" і закончь:

Слава Табе, Божа наш, Слава Табе. Амін.

МАЛІТВА ДА СЬВЯТОГА ДУХА

Уладару Нябесны, Пацяшыцелю, Духу Праўды, што ўсюды ёсьць і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра й Жыцьцядацелю, прыйдзі й усяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і спасі, Добры, душы нашы.

ТРЫСЬВЯТОЕ

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас.

(тры разы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА ДА ПРАСЬВЯТОЕ ТРОЙЦЫ

Прасьвятая Тройца, памілуй нас. Госпаду, ачысьці грахі нашыя, Уладыка даруй беззаконнасьці нашыя. Сьвяты наведай нас і аздараві немачы нашыя дзеля імя Твайго.

Госпаду памілуй. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА ГОСПАДАВА

Ойча наш, Каторы ёсьць у Нябёсах. Хай сьвяціцца імя Тваё. Хай прыйдзе Ўладарства Тваё, хай будзе воля Твая, як на Небе, так і на зямлі. Хлеб наш штодзённы дай нам сяньня. І даруй нам даўгі нашы, як і мы даруем даўжнікам нашым, і не ўвядзі нас у спакусу, але збаў нас ад нячысьціка.

Тваё ёсьць Уладарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

РАНІЧНЫЯ ТРАПАРЫ

Устаўшы ад сну, прыпадаем да Цябе, Добры, і ангельскую песьню натхнёна пяем Табе: Сьвят, Сьвят, Сьвят Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Госпаду, што з пасьцелі й сну падняў мяне, прасьвятлі розум мой і сэрца маё, і вусны мае адчыні, каб пяяць Табе, Сьвятая Тройца: Сьвят, Сьвят, Сьвят Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

І цяпер, і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

Неспадзявана Судзьдзя прыйдзе, і выявяцца ўчынкі кожнага, таму апоўначы із страхам ускліцам: Сьвят, Сьвят, Сьвят Ты, Божа, Багародзіцаю памілуй нас.

Госпаду памілуй. *(12 раз)*

МАЛІТВА ДА СЬВЯТОЕ ТРОЙЦЫ

Устаўшы ад сну дзякую Табе, Трыадзіны Божа, што дзеля Твае дабраты й цярплівасьці не загневаўся Ты на мяне лянівага й грэшнага і не загубіў мяне з беззаконствамі маймі; але дзеля Свае людалюбнасьці падняў мяне, што спачываў бяз памяці, каб я ранічнаю малітваю ўслаўляў уладу Тваю. І цяпер прасьвятлі вочы духа маяго, адчыні вусны мае пазнаваць Навуку Тваю і разумець запаведы Твае, выконваць волю Тваю, і пяяць Табе зь вераю ў сэрцы, і ў песьнях услаўляць усесьвятое ймя Твае: Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

Прыйдзеце, пакланемся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да самога Хрыста, Уладара й Бога нашага.

МАЛІТВА Сьв. МАКАРА ВЯЛІКАГА

Божа, ачысьці мяне грэшнага, бо ніколі я не зрабіў нічога добрага перад Табою, але вызваль мяне ад нячыстага, і хай будзе ўва мне воля Твая, хай беззаганна адчыню недастойныя вусны мае, і ўсхвалю імя Тваё Сьвятое: Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і навекі вечныя. Амін.

ДРУГАЯ МАЛІТВА
Сьв. МАКАРА ВЯЛІКАГА

Да Цябе, Уладару Людалюбча, устаўшы ад сну сьпяшаюся, насьляваць Цябе жадаю дзеля міласэрдзя Тваяго, і малюся да Цябе: памажы мне ў кожным часе, у кожнай рэчы, і захавай мяне ад усякіх людзкіх благіх учынкаў, і д'явальскае спакусы, і збаў мяне, і ўвядзі ў Валадарства Твае вечнае. Бо Ты мой Творца, і ўсякага дабра Крыніца й Падаўца, і на Цябе ўся надзея мая, і Табе хвалу чыню, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА ДА АНГЕЛА АХОЎНІКА РАНА

Сьвяты ангелу, памочніча стурбаванай душы мае й клапатлівага жыцьця маяго, не адыходзь ад мяне за няўстрыманасьць маю, ня дай злому духу сілком завалодаць сьмяротным целам майім. Узмацні зьняможаныя й слабыя сілы мае, і накіруй мяне на шлях спасеньня. Так, сьвяты ангеле Божы, абароньніча й ахоўніку мае ўбогае душы і цела, усё мне даруй, чым я скрыўдзіў Цябе праз усё жыцьцё маё, і калі я ў нечым зграшыў мінулае ночы, заступіся за мяне гэтага дня, і захавай мяне ад усякае згубнае спакусы, каб я ніякім грэхам не ўгнявіў Бога, і маліся за мяне да Госпада, каб Ён умацаваў мяне ў послуху Яму, і зрабіў мяне годным слугою дабраты Свае. Амін.

СЛАЎЛЕНЬНЕ ПРАСЬВЯТОЕ БАГАРОДЗІЦЫ

Багародзіца Дзева, радуйся! Дабрадатная Марыя, Гаспод з Табою. Дабраслаўленая Ты між жанчын, і дабраслаўлены плод улоньня Твайго, бо Ты радзіла Спаса душ нашых.

Пад Тваю міласьць прыбягаем, Багародзіца Дзева, малітваў нашых не адкінь у цярпеньнях, але ад бедаў спасі нас. Адзіна чыстая, і Дабраслаўленая. Прасьвятая Багародзіца, спасі нас!

ТРАПАР КРЫЖА ЗА БАЦЬКАЎШЧЫНУ.

Спасі Госпаду людзей Тваіх, і дабраслаў маемасьць Тваю. Перамогу дабраверным хрысьцянам над супраціўнымі даруй, і Тваім Крыжам сьвятым барані зямлю Тваю.

МАЛІТВА ХВАЛЫ ДА ПРАСЬВЯТОЕ БАГАРОДЗІЦЫ

Дастойна ёсьць запраўды славіць Цябе, Багародзіцу, заўсёды шчасьлівую, і найчыстшую, і Маці Бога нашага. Сьцьнейшую за Херувімаў і без параўнаньня слаўнейшую за Серахвімаў, што нарадзіла Бога Слова, непарушаную, існую Багародзіцу Цябе ўзьвялічаем.

СЫМБАЛЬ ПРАВАСЛАЎНАЕ ВЕРЫ

Веру ў Вадзінага Бога Айца, Уседзяржыцеля, Тварца Неба й зямлі, усяго відзімага й нявідзімага. І ўвадзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, Адзінароднага, ад Айца роджанага перад усімі вякамі: Сьвятло ад Сьвятла, Бога праўдзівага, нястворанага але народжанага, аднаістнага з Айцом, праз Якога ўсё сталася. Дзеля нас людзей, і дзеля нашага спасеньня што зыйшоў зь Нябёсаў, і ўцелесьненага праз Духа Сьвятога й Дзевы Марыі, і ўчалавечанага. Укрыжаванага за нас пры Понцкім Пілаце, і цярпеўшага, і пахаванага. І ўваскрослага на трэйці дзень згодна з Пісаньнем. Узыйшоўшага ў Нябёсы, і сядзячага праваруч Айца. Маючага зноў прыйсьці ў славе, судзіць жывых і памерлых. Ягонаму-ж уладарству

ня будзе канца. І ў Духа Сьвятога, Госпада жыцьцетворчага, ад Айца зыходзячага, з Айцом і Сынам супакланяльнага й слаўленага, што гаварыў праз прарокаў. І ў Вадзіную, Сьвятую, Саборную, і Апостальскую Царкву. Вызнаю адзіны хрост на збаўленьне ад грахоў. Чакаю ўваскрасеньня памерлых, жыцьця будучага час. Амін.

ПСАЛЬМ 50 (каяльны)

Зьмілуйся нада мною, Божа, дзеля вялікае міласэрнасьці Тваё, і па мноству дабротаў Тваіх ачысьці беззаконнасьці мае. Найперш абмый мяне ад правіны мае, і ачысьці мяне ад грэху майго. Бо ведаю добра беззаконьне мае, і грэх мой усьцяж перада мною. Перад Табою, Табою адзіным я зграшыў, і зло перад Табою ўчыніў: бо Ты справядлівы ў засудзе Тваім, і пераможаш, калі Цябе судзяць. Бо, вось, у беззаконнасьці я зачаты, і ў грахох радзіла мяне маці мая. Бо-ж Ты праўду палюбіў: нязнанае й тайнае мудрасьці Тваё адкрыў Ты мне. Акрапі мяне ісопам, і ачышчуся, абмый мяне, і стану за сьнег бялейшым. Дай Ты мне пачуць радасьць і вясёласьць: і ўсьцешацца пакорныя косьці мае. Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх, і ўсе беззаконствы мае ачысь-

ці. Ствары ўва мне, Божа, чыстае сэрца, і абнаві ўва мне духа праўды. Не адкінь мяне ад абліччa Твайго, і Духа Твайго Сьвятога не адбяры ад мяне. Зьвярні мне радасьць спасеньня Твайго, і духам валадарным умацуй мяне. Шляхі Твае буду я беззаконным паказваць, і грэшнікі вернуцца да Цябе. Вызваль мяне ад крывавых учынкаў, Божа, Божа спасеньня майго, і язык мой будзе радасна славіць праўду Тваю. Госпаду, адчыні вусны мае, і будуць яны абвяшчаць хвалу Тваю. Бо калі-б Ты захацеў ахвяры, я даў бы, але целапаленьні ня любыя Табе. Ахвяра Богу – дух пакутны: сэрцам збалелым і пакорным Ты, Божа, ня грэбуеш: Шчасьці, Госпаду, з Ласкі Свае Сіону, узьвядзі нанова муры Ерусаліму. Тады прыймеш Ты ласкава ахвяры праўды, целапаленьні й дары агністыя: тады на аўтар Твой пакладуць быкі.

МАЛІТВА ЗА ЖЫВЫХ

Спасі Госпаду, зьмілуйся над праваслаўнымі патрыярхамі, япіскапамі й усімі духаўнікамі, што Ты паставіў іх даглядаць агул Твой хрысьцянскі і малітвамі іх зьмілуйся й спасі мяне.

Спасі Госпаду, зьмілуйся над айцом маім духоўным *(імя)*
і сьвятымі малітвамі яго даруй мне грахі мае. *(паклон)*

Спасі Госпаду, зьмілуйся над бацькамі маймі *(імёны)*
братамі й сёстрамі *(імёны)*
і над усімі маймі роднымі й блізкімі, і падай ім Тваю Ласку: супакой, радасьць і дабро *(паклон)*

Спасі Госпаду, зьмілуйся над старымі й малымі, над беднымі, сіротамі, удовамі, у хваробе, горы, бядзе й смутку прабываючымі. І над тымі запраўднымі слугамі Тваймі,

што за Цябе й за Веру Праваслаўную дзеля бязбожнікаў, адступнікаў і гарэтыкаў у цямніцах, вязьніцах прабываюць і пакутуюць. Памяні іх Госпаду, і адведай, і ўзмацні, і пацеш іх, і сілаю Тваёю хуткае вызваленьне, свабоду ім падай.

(паклон)

Спасі, Госпаду, зьмілуйся над тымі, што ў далёкіх службах прабываюць, падарожуюць, айцоў, братоў і сёстраў нашых, і ўсіх праваслаўных хрысьцян. *(паклон)*

Спасі, Госпаду, зьмілуйся над тымі, што ненавідзяць і крыўдзяць мяне, і спрычыняюць мне ўсякія прыкрасьці, і ня дай ім загінуць дзеля мяне грэшнага. *(паклон)*

Тых, што адыйшлі ад Праваслаўнае Веры, і згубнымі гарэзіямі засьлепленых, сьвятлом Твайго пазнаньня асьвятлі, і да Тваёй Сьвятой Саборнай Апостальскай Царквы далучы *(паклон)*

МАЛІТВА ЗА ПАМЕРЛЫХ

Успамяні, Госпаду, душы спачылых слугаў Тваіх, бацькоў маіх *(імёны)* і ўсіх родных маіх, і выбач ім усе грахі іхныя – сьведамыя й нясьведамыя, прымі да Сябе ў Царства вечнае славы Твае, бясконцага шчасьця, і радасьці нявымоўнае на векі. *(паклон)*

Успамяні, Госпаду, усіх спачылых у надзеі ўваскрашэньня й жыцьця вечнага айцоў, братоў і сёстраў нашых, тут і паўсюды пахаваных праваслаўных хрысьцян, супакой іх разам са Сьвятымі Тваймі, дзе зьзяе сьвятло абліччa Твайго, і нас памілуй, бо Ты добры й людалюбны. Амін. *(паклон)*

Падай, Госпаду, выбачэньне грахоў усім тым, што адышлі ў веры й надзеі ўваскрашэньня айцом, бра-

том і сёстрам нашым, і ўчыні ім вечную памяць. *(тры разы)*

Амін.

МАЛІТВА ДА СВАЙГО Сьв. ІМЕНЬНІКА

Малі Бога за мяне, Сьвяты(-ая) Угодніча(-ца) Божы(-ая), *(імя)* бо да Цябе я горача зьвяртаюся, як да хуткага(-ай) памочніка(-цы), і малітаўніка(-цы) аб душы маёй.

МАЛІТВЫ НА ПРАЦЯГУ ДНЯ

МАЛІТВА ПЕРАД ПАЧАТКАМ УСЯКАЕ ПРАЦЫ

Госпаду Ісусе Хрысьце, Адзінародны Сыне безпачатнага Твайго Айца, Ты сказаў Сваімі найсьвятшымі вуснамі: "Безь Мяне вы нічога добрага ня можаце зрабіць". Госпаду мой, Госпаду, успрыняўшы верою гэтыя сьвятыя словы Твае ў сэрца й душу маю, я зварочваюся да Твае дабраты, і малю Цябе: памажы мне грэшнаму гэтую маю працу, што цяпер пачынаю, як для Цябе Самога выканаць, у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

Або коратка: Госпаду багаславі.

МАЛІТВА ПЕРАД НАВУКАЮ

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа.

Магутны Божа! Пашлі нам ласку Духа Тваяго Сьвятога, Каторы дае й мацуе нашыя душэўныя сілы, каб мы ўважна слухалі выкладаныя нам навукі, і расьлі Табе, Творцы нашаму на славу, нашым бацьком і настаўнікам на радасьць, Царкве й бацькаўшчыне нашай на дабро й чэсьць. Амін.

Або: – "Уладару Нябесны ..."

МАЛІТВА ПАСЬЛЯ НАВУКІ

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа.

Дзякуем Табе, Стварыцелю, што ласкава дазволіў нам уважліва выслухаць навуку. Дабраслаў нашых кіраўнікоў, бацькоў і настаўнікаў, якія вядуць нас да пазнаньня дабра, і дай ім сілу і здатнасьць прадаўжаць гэтую навуку. Амін.

Або: – "Дастойна ёсьць ..."

МАЛІТВА ПЕРАД ЯДОЮ

Вочы ўсіх да Цябе, Госпаду, зьвяртаюцца з надзеяй, і Ты даеш усім ежу ў свой час, адкрываеш шчодрую руку Тваю, і ўсё жывое добра насычаеш. *Або: – "Ойча Наш..."*

МАЛІТВА ПАСЬЛЯ ЯДЫ

Дзякуем Табе, Хрысьце Божа наш, што насыціў нас зямнымі Тваймі дарамі, не пазбаў нас і Нябеснага Твайго ўладарства, але як паміж вучняў Тваіх, Ты прыйшоў калісь, супакой даючы ім, гэтак і да нас прыйдзі, і спасі нас.

Або: Слава Табе, Госпаду, слава Табе. Слава Табе Сьвяты ўладару, што даў нам ежу, напоўні нас і Духам Сьвятым, і мы станем перад Табою чыстымі й незасаромленымі, калі Ты будзеш аддаваць кожнаму паводля ўчынкаў яго.

МАЛІТВЫ ПЕРАД СНОМ.

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя . Амін. *(тры разы)*

Госпаду Ісусе Хрысьце, Сыне Божы, дзеля малітваў Прачыстае Маці Твае, прападобных і баганосных айцоў нашых, і ўсіх сьвятых, зьмілуйся над намі. Амін. Слава Табе, Божа, слава Табе. Божа, будзь міласьцівы мне грэшнаму(-ай).

Уладару Нябесны... Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

Прасьвятая Тройца... Госпаду памілуй
Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін. Ойча наш...

ТРАПАРЫ ВЯЧЭРНІЯ

Памілуй нас, Госпаду, памілуй нас: ніякага адказу ня сьмеючы чакаць, мы грэшныя, Табе, як уладару, гэтую малітву прыносім: памілуй нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Госпаду памілуй нас, бо на Цябе мы надзею маем! Не загневайся на нас вельмі, і не ўспамінай беззаконстваў нашых, але глянь, і цяпер, як ласкі поўны, і збаў нас ад ворагаў нашых! Бо Ты Бог наш, а мы людзі Твае, усе стварэньні рук Тваіх, і імя Тваё клічам.

Цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

Міласэрдзя дзьверы адчыні нам, дабраслаўленая Багародзіца, каб мы, што на Цябе надзею маем, не загінулі, але збавіліся Табою ад бедаў,

бо Ты спасеньне роду хрысьцянскага.

Госпаду, памілуй. *(12 раз)*

МАЛІТВА ДАРАВАНЬНЯ ГРАХОЎ

Госпаду Божа наш, усё, што награшыў я сяньня, словам, учынкамі й думкаю, як Добры й Людалюбны, даруй мне. Пашлі Твайго Ангела Ахоўніка, які памагае мне й бароніць мяне ад усякага зла. Бо Ты Абароньнік душаў і целаў нашых і Табе мы славу ўвассылаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА Сьв. МАКАРА ВЯЛІКАГА

Божа вечны, і ўладару ўсякага стварэньня, што дазволіў мне дажыць да гэтае часіны, даруй мне грахі, якія сяньня ўчынкамі, словам, або думкаю я зрабіў, і ачысьці Госпаду, у начы, што надыходзіць, супакойны сон, каб устаўшы рана з пасьцелі мае, я славіў найсьвяцейшае імя Тваё праз увесь час жыцьця маяго, і перамог ворагаў цялесных і безцялесных, што нападаюць на мяне... І збаў мяне, Госпаду, ад блудных думкаў, што занячышчаюць мяне, і пажаданьняў шкадлівых. Бо Тваё ёсьць уладарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА Сьв. АНЦІЁХА

Уседзяржыцелю, Слова Войчае, адзіна дасканалы Ісусе Хрысьце, дзеля вялікага міласэрдзя Твайго, ніколі не пакідай мяне, слугі Твайго, але заўсёды прабывай ува мне, Ісусе, добры пастыру Тваіх авечак, не аддай мяне злобе зьмяінай і жаданьням Сатаны, бо насеньне ўпадку ўва мне ёсьць. Таму Ты, Госпаду Божа, адзіна годны ўсякае хвалы, Уладару Сьвяты, Ісусе Хрысьце, ахіні мяне ўва сьне вечным Сьвятлом, Духам Тваім Сьвятым, Катораым Ты асьвеціў вучняў Тваіх. Дай, Госпаду, і мне, нягоднаму рабу Тваяму спасеньне Тваё на пасьцелі маёй: прасьвятлі розум мой сьвятлом мудрасьці Сьвятога Евангельля Твайго, душу любоўю сьвятога Крыжа Твайго, сэрца чысьцінёю Словаў Тваіх, цела маё Тваёю жарсьцяй бязжарстнаю, думку маю Тваёю па-

кораю напоўні, і падымі мяне ў належны час на слаўленьне Цябе. Бо Табе адзінаму ўсякая хвала й слава разам з Беспачатным Айцом Тваім, і з Прасьвятым Духам па век веку. Амін.

МАЛІТВА ДА ПРАСЬВЯТОЕ БАГАРОДЗІЦЫ

Добрага Ўладара Добрая Маці, Прачыстая й Дабраслаўленая Багародзіца Марыя, пашлі на несупакойную душу маю міласьць Сына Твайго й Бога нашага, і Тваімі малітвамі ўзьвядзі мяне на шлях дабра, каб я рэшту жыцьця свайго без заганы прайшоў, і Табою рай здабыў, Багародзіца Дзева, адзіна Чыстая й Дабраслаўленая.

МАЛІТВА ДА Сьв. АНГЕЛА АХОЎНІКА ВЕЧАРАМ

Ангелу Хрыстоў, ахоўніча мой сьвяты, і абароньніча душы й цела майго, усё мне даруй, у чым я зграшыў сяньня, і ад усякага подступу супраціўнага мне ворага збаў мяне, каб ніякім грэхам я не ўгнявіў Бога маяго. Але маліся за мяне грэшнага й нягоднага слугу, каб праз Цябе стацца мне годным дабраты й міласьці ўсёсьвятой Тройцы і Маці Госпада майго Ісуса Хрыста, і ўсіх Сьвятых. Амін.

МАЛІТВА ДА ПРАСЬВЯТОЕ БАГАРОДЗІЦЫ

Найслаўнейшая Вечнадзева, Маці Хрыста Бога, прынясі нашую малітву Сыну Твайму й Богу нашаму, каб Ён спас Табою душы нашыя. Уся мая надзея на Цябе, Маці Божая, захавай мяне пад пакровам Тваім. Багародзіца Дзева, не адкінь мяне грэшнага, што прагне дапамогі Тваё й Твайго заступніцтва: бо на Цябе надзея душы мае, памілуй мяне.

МАЛІТВА Сьв. ЯНЬНІКІЯ

Спадзяваньне маё – Айцец, прыпынак мой – Сын, пакроў мой – Дух Сьвяты. Тройца Сьвятая, слава Табе.

Закончыць гэтак:

Дастойна ёсьць... Слава Айцу, і Сыну, і Духу Сьвятому, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін. Госпаду памілуй. *(тры разы)*

Госпаду Ісусе Хрысьце, дзеля малітваў Прачыстае Маці Твае, і ўсіх Сьвятых, памілуй нас.

У ймя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін. *(тры разы)*

Пасьля гэтага, калі ўжо йдзеш спаць, ахіні тры разы знакам крыжа сваю пасьцель, і маліся:

Атулі мяне, Госпаду, сілаю Пачэснага й Жыцьцятворнага Крыжа Твайго, і захавай мяне ад усякага

ліха. У рукі Твае, Госпаду Ісусе Хрысьце, Божа мой, аддаю дух мой. Ты-ж дабраслаў мяне, Ты мяне памілуй, і жыцьцё вечнае дай мне. Амін.

РОЗНЫЯ МАЛІТВЫ

МАЛІТВА СУПРАЦЬ ЗЛОГА

І ўваскрэсьне Бог, і рассыплюцца варагі Яго, і ўцякуць перад абліччам усе, што ненавідзяць Яго. Як разьвяваецца дым, так хай разьвеяны будуць, як тае воск перад вагнём, так хай чэрці зьгінуць перад тымі, што любяць Бога, што ахінаюць сябе знакам крыжа й у весялосьці кажуць: Радуйся Найсьвятшы й Жыцьцятворчы Крыжу Госпадні! Ты праганяеш чортаў сілаю на Табе ўкрыжаванага Госпада нашага Ісуса Хрыста, Каторы ў пекла зыйшоў і сілу дыявала перамог, і дараваў нам Цябе, Крыж свой пачэсны, на збаўленьне ад усякага супраціўніка. О, найсьвяцейшы і Жыцьцятворчы Крыжу Госпадні! Памагай мне із сьвятою Ўладаркаю Дзеваю Багародзіцаю, і з усімі сьвятымі на векі. Амін.

МАЛІТВА КАЯНЬНЯ Й НАШЫХ ПРОСЬБАЎ ДА ГОСПАДА

Паменш, пакінь, прабач, Божа, грахі нашыя, вольныя й нявольныя, якія мы ўчынілі словам ці чынам, сьведама ці нясьведама, днём ці ўначы, у думках ці замерах: усе нам даруй, бо Ты Добры й Людалюбны.

Тым, што нас ненавідзяць і крыўдзяць, даруй Госпаду, Людалюбівы. Тым, што дабро робяць, памнож іхнае дабро. Братом і сваяком нашым даруй, каб іхныя просьбы аб спасеньні прывялі іх у жыцьцё вечнае. Хворых адведай і ўздараві іх. Тымі, што на морах, кіруй. З тымі, што ў падарожжах, спадарожнічуй. Хрысталюбовым уладам памагай. Тым, што нам памагаюць і нас любяць, грахі даруй. Тым, што просяць нас памаліцца за іх, памілуй

подле вялікае міласьці Твае. Успомні, Госпаду, адыйшоўшых айцоў і братоў нашых, і супакой іх у сьветласьцях абліччa Твайго. Успомні, Госпаду, братоў нашых, што ў палоне, і вызваль іх ад усякае бяды. Успомні, Госпаду, тых, што прыносяць добры плод і дабро чыняць у сьвятых Тваіх цэрквах, выслухай іхныя просьбы аб спасеньню, і дай ім жыцьцё вечнае. Успомні, Госпаду, і нас, пакорных, грэшных і нягодных слугаў Тваіх, і прасьвятлі наш розум сьветлам мудрасьці Твае, і настаў нас на шлях запаведаў Тваіх, малітвамі Прачыстае Ўладаркі нашае Багародзіцы й Вечнадзевы Марыі, і ўсіх Тваіх сьвятых. Бо Ты дабраслаўлены на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА ПЕРАД СПОВЯДЗЬДЗЮ

Госпаду Божа наш, Ты не жадаеш сьмерці грэшніка, але хочаш, каб ён вярнуўся да Цябе, і законна жыў. Зьвяртаюся й я да Цябе, мой Божа: прыймі маё каяньне, пашлі майму сэрцу зразуменьне віны, узруш маё сумленьне, каб мая споведзь была перад Табою шчырая й праўдзівая, і дай мне цьвёрдую волю дзеля моцнае пастановы весьці жыцьцё маё шляхам праведнасьці й годнасьці, услаўляць на кожным ступню майго жыцьця сьвятое ймя Тваё, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА КАЯНЬНЯ

Вызнаю Табе, Госпаду Богу майму й Творцы, у Сьвятой Тройцы адзінаму, годнаму славы й пакланеньня Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, усе мае грахі, што ўчыніў я праз маё жыцьцё, у кожную часіну й у цяперашнім часе ўчынкам, словам, думкаю, бачаньнем, слыхам, нюхам, смакам, вошчупам, і ўсімі маймі пачуцьцямі душэўнымі й цялеснымі, якімі Цябе, Бога майго й Творцу, я ўгнявіў і свайго бліжняга зьняважыў, усяго гэтага шкадую, прызнаю сябе вінаватым прад Табою, Божа мой, і маю волю да каяньня. Толькі Ты, Госпаду Божа мой, памажы мне, сьлёзна й пакорна прашу Цябе: учыненыя мною грахі мае й правіны міласэрдзем Тваім даруй мне, і збаў мяне ад іх усіх, бо Ты Добры й Людалюбівы. Амін.

МАЛІТВА перад Сьв. ПРЫЧАСЬЦЕМ

Знаю, Госпаду, што калі нягодна прыйму Найсьвятшае Цела Тваё, і Пачэсную Кроў Тваю, то буду вінаватым, спажыву сябе на засуджэньне без належнае развагі аб Целе й Крыві, Цябе, Хрыста й Бога майго. Але спадзяюся на Тваё міласэрдзе, прыходжу да Цябе, Каторы сказаў: "Хто спажывае Цела Маё, і п'е Кроў Маю, той ува мне прабывае, і Я ў ім". Таму зьмілуйся, Госпаду, і не засудзі мяне грэшнага, але ўчыні зы мною подле міласьці Твае: і хай будуць мне гэтыя Сьвятасьці на аздараўленьне, і ачышчэньне, і асьвятленьне, і захаваньне, і спасеньне, і на асьвячаньне душы й цела, на разьвеяньне ўсякіх благіх мрыяў і ўплыву нячыстага, што думкаю прыхавана ў маім целе дзее. Хай будзе на спадзяваньне й любоў да Цябе: на

паправу й умацаваньне жыцьця, на рост цнотаў і дасканаласьці, на споўненьне Тваіх запаведаў, на лучнасьць з Духам Сьвятым, успамогай да жыцьця вечнага, на добры адказ на страшным судзе Тваім: а ніколі ня будзе мне ў суд ці засуджэньне. Амін.

МАЛІТВА

перад самым Сьв. ПРЫЧАСЬЦЕМ

Веру Госпаду, і адкрыта сьветчу, што Ты ёсьць запраўдны Хрыстос, Сын Бога жывога, Каторы прыйшоў на сьвет грэшных спасьці, між якімі я ёсьць першы. Яшчэ веру, што гэта ёсьць Найчысьцейшае Цела Тваё, і гэта найпачэсьнейшая Кроў Твая. Таму малюся Табе: памілуй мяне, і даруй грахі мае ўмысныя й няўмысныя, ці то словам, ці

ўчынкам, сьведамыя й нясьведамыя: і ўдастой мяне незасудна прычасьціцца прачыстых Тваіх Тайнаў на адпушчэньне грахоў і ў жыцьцё вечнае. Амін.

Вячэры Твае Тайнае сяньня, Сыну Божы, удзельнікам мяне прыймі: ворагам бо Тваім Тайны не скажу, ні цалаваньня Табе дам, як Юда, але як разбойнік клічу Цябе: Успомні мяне, Госпаду, у валадарстве Тваім.

Няхай не на суд, а ні на засуджэньне будзе мне прычашчэньне Сьвятых Тваіх Тайнаў, Госпаду, але на ўздараўленьне душы й цела.

Божа, будзь міласьцівы мне грэшнаму.

МАЛІТВА пасьля Сьв. ПРЫЧАСЬЦЯ

Слава Табе, Божа, Слава Табе!
(тры разы)

Дзякую Табе, Госпаду Божа мой, што не адкінуў Ты мяне грэшнага, але дазволіў мне быць удзельнікам Тваіх Сьвятасьцяў. Дзякую Табе, што ўдастоіў мяне нявартага прычасьціцца Прачыстых Тваіх Нябесных Дараў. Але, Уладару й Людалюбча, што дзеля нас памер і ўваскрос, і даў нам страшныя й жыцьцятворчыя Таінствы на дабро й асьвячаньне душы й цела, на разьвеяньне ўсяго супраціўнага, на прасьвятляненьне вачэй сэрца майго, на супакой маіх душэўных сіна незасудную веру, на любоў някрывадушную. На паўнату мудрасьці, на выкананьне запаведаў Тваіх, на павялічэньне Боскае ласкі Твае, і на асягненьне Твайго Ўладарст-

ва: каб усім гэтым у сьвятыні Тваёй захаваны, я памятаў заўсёды ласку Тваю, і ўжо ня дзеля сябе жыў, а дзеля Цябе, нашага Ўладара й Дабрадзея. Дык, гэтае жыцьцё пакінуўшы ў надзеі жыцьця вечнага, асягну на векі супакой, дзе голас сьвяткуючых бязупынны, і бясконцая любата тых, што бачаць аблічча Тваяго красу нявымоўную. Бо Ты ёсьць праўдзівае жаданьне й бязьмежная радасьць тых, што любяць Цябе, Хрысьце Божа наш, і ўсякае стварэньне пяе хвалу Табе на векі. Амін.

МАЛІТВА Сьв. ВАСІЛЯ ВЯЛІКАГА пасьля ПРЫЧАСЬЦЯ

Госпаду Хрысьце Божа, Уладару вякоў і Творца ўсяго! Дзякую Табе за ўсё добрае, што Ты даў мне, і за прычашчэньне Тваіх Найсьвятшых і Жыцьцятворных Тайнаў. І прашу Цябе, Добры й Людалюбівы: захавай мяне пад пакровам Тваім і пад апекай крыльляў Тваіх, і дай мне да апошняга дыху майго з чыстым сумленьнем прычашчацца Сьвятасьцяў Тваіх на адпушчэньне грахоў і ў жыцьцё вечнае. Бо Ты ёсьць Хлеб Жыцьця, крыніца сьвятасьці, падаўца дабра, і Табе славу засылаем з Айцом і Сьвятым Духам, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА ПАДЗЯКІ Сьв. АМБРОЗІЯ

Цябе Бога славім, Цябе Госпада славасловім, Цябе, прадвечнага Айца, уся зямля ўзьвялічае. Табе ўсе Ангелы, Табе Нябёсы й усе сілы, Табе Херувімы й Серахвімы бязупынна пяюць: Сьвят, Сьвят Госпад Саваоф, поўныя Неба й зямля велічнае славы Твае.

Цябе найслаўнейшы Апостальскі Сабор, Цябе хвальнае прарочае войска мучанікаў, Цябе па ўсім сьвеце Сьвятая Царква ўслаўляе, як Айца непрыступнае велічы, і супакланяльнага Твайго праўдзівага й Адзінароднага Сына, і Сьвятога Духа Пацяшыцеля.

Ты Валадар славы, Хрысьце. Ты Сын Вечнаіснага Айца. Ты дзеля нашага спасеньня стаўся чалавекам, не пагрэбаваў улоньням Дзевы. Ты джала сьмерці скрышыў, веруючым уладарства Нябеснае адчыніў.

Ты ў славе Айцоўскай на правіцы Бога сядзіш, і верым, як Судзьдзя прыйдзеш. Таму просім Цябе: памажы слугам Тваім, якіх Ты Пачэснаю Крывёю выкупіў. Дазволь нам із Сьвятымі Тваймі ў славе вечнай Тваёй пасад мець. Спасі, Госпаду, людзей Тваіх і дабраслаў маемасьць Тваю, кіруй імі, і ўслаў іх на векі.

Усе дні дабраславім Цябе, і хвалім імя Тваё бязупынна й на векі вечныя. Дазволь, Госпаду, у гэты дзень бяз грэху захавацца нам.

Зьмілуйся над намі, Госпаду, зьмілуйся над намі. Хай будзе міласьць Твая на нас, бо мы спадзяёмся на Цябе. На Цябе, Госпаду, маем надзею, і не засаромімся навекі. Амін.

Жыровіцкая Найсьвяцейшая
Дзева Марыя.

МАЛІТВА да ЖЫРОВІЦКАЕ БАГАМАЦІ

Найсьвяцейшая Дзева Марыя, нашая найлепшая Маці й Уладарка, выслухай нашую просьбу.

Ты-бо адзіна Чыстая й Звышдабраслаўленая Багародзіца, Дзева Марыя, Уладарка Беларусі, што сьвеціш у Жыровіцах цяпер і на векі вечныя.

Амін.

МАЛІТВА да Сьв. ЕЎПРАСІНЬНІ

О, сьвятая й слаўная апякунка й асьветніца народу Беларускага, Маці нашая, Еўпрасіньня! Глянь ласкавым вокам сваім на братоў і сёстры Твае, што зь любоўю й надзеяй вочы душаў сваіх да Цябе падыймаюць. Ты не засудзіла нас, што мы ў няволі сваёй доўгі час не маглі славіць Цябе ў цэрквах сваіх весьвятога ймені Твайго. Бо мы ведаем, што гэта Ты сьвятымі малітвамі сваймі выпрасіла нам ласку Спаса нашага, і мы цяпер у сьвятых цэрквах сваіх можам аддаваць хвалу Трыадзінаму Богу й Табе. Таму й удзячныя сэрцы нашыя, поўныя любові й падзякі да Цябе, у захапленьні сьпяваюць: РАДУЙСЯ !

Радуйся, Заступніца, Апякунка й Малельніца нашая! Радуйся, рада-

ваньне Полацкае й усяе зямлі нашае! Радуйся, дзеваў чысьціня й зьзяньне! Радуйся, прамень Веры нашае! Радуйся, асьвячаньне любае Беларусі нашае! Радуйся, дабро, праўду, красу й згоду ў краіне нашай пашыральніца! Радуйся, памочніца пакрыўджаных, сумных пацяшэньне! Радуйся, удоваў і сіротаў заступленьне! Радуйся, кветка з райскага саду несьмягнучая! Радуйся ў веры нашай на выгнаньнях і ў пакутах падтрыманьне! Радуйся, хворых і паміраючых пацеха й вызвдараўленьне! Радуйся, да гробу Хрыстовага з сьвятымі пахамі прыходзячая! Радуйся, усё Хрысту ахвяраваўшая! Радуйся, сьвятых угоднікаў Божых краіны нашае зьзяньне, веліч і слава! Радуйся, сьвятая Маці нашая, Еўпрасіньня!

Прыймі, Заступніца нашая, гэ-

тую Малітву братоў і сёстраў Тваіх, як нашую нявымоўную падзяку, любоў і хвалу Табе: надзея, чэсьць і пацеха нашая! Усе мы з радасьцю аддаем сябе пад сьвятую апеку Тваю. Маліся і далей за шматпакутны народ наш перад пасадам Усявышняга, каб мы сталіся сьвятым, выбраным народам Яго! Каб Ён Духам Сваім Сьвятым узмацняў і прасьвятляў душы й сэрцы нашых пастыраў і павадыроў, пацяшаў і радаваў нашых удоваў і сіротаў, а ўсім нам паслаў супакой і радасьць на чужыне, і прывёў нас на вольную зямельку нашую, каб мы ўсе разам там маглі славіць Цябе, і пяяць хвалу Яму, Спасу нашаму, ды цешыцца й радавацца ў Валадарстве славы Яго на векі вечныя. Амін.

МАЛІТВА да Сьв. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА

Сьвяты Кірыле, любы браце наш, Ты – бяздоннае мора духовага багацьця й красы Божае! Ты, абраз духовае велічы нашых пабожных прашчураў! Ты, люстра дабраты іх! Ты, нашыя ангельскія вусны на Небе! Ты, нашыя духовыя арлінын крыльлі да раю! Ты, Жывая Вада Госпада! Ты, знак нашае любові перад Пасадам Божым, нашая надзея на Яго! Ты, наш ходальнік перад Справядлівым Судзьдзёю! Ты, наш Беларускі каштоўны дыямант у кароне найбольшых сьвятых! Ты, нашая зьзяючая слава Божая, бліскучы розум нашага народу, нашая сьвятасьць, і нашая радасьць на векі.

Сьвяты Кірыле, любы браце наш, малі Бога за нас! Амін.

МАЛІТВА

Уладару Неба й зямлі, Спрадвечны Божа! Ласка Твая да Нябёсаў, а праўда над воблакі! Ты ўвесь сьвет стварыў і Духам Сьвятым усё прасьвятляеш, ажыўляеш і мацуеш! Ты адвечныя правы да ўсяго ўстанавіў, кажнаму месца й мэту прызначыў, а людзкі род так палюбіў, што Сына Свайго Адзінароднага на зямлю паслаў, каб усе, што выпаўняюць навуку Ягоную ды йдуць дарогаю Ягонаю, сталі сынамі Тваймі, падобнымі да ангелаў сьвятых, удзельнікаў Твайго Нябеснага Ўладарства.

Мы, дзеці Беларускага народу, поўнілі Волю Тваю й Запаведы Твае, ішлі шляхамі Тваймі й пабожных прашчураў нашых, але з прычыны слабасьцяў людзкіх зьневяраліся й падалі, і гэтым вельмі зьне免важалі Цябе шматлікімі грахамі сваймі.

Але Ты, Госпаду, адзіны бяз грэху, поўны ласкі, любові, міласэрдзя й даравaньня! На каленях молім Цябе: да-

руй нам вольныя й нявольныя грахі й правіны нашыя. Даруй нам усякі нядобры ўчынак як да сябе самых, так і да іншых. Даруй і тым, што крыўдзілі й зьняважалі нас.

Мы молім Цябе ў шчырай пакоры думаў нашых, барані нас ад усякіх напасьцяў варожых, і дай нам і непрыяцелям нашым Тваёю шчодраю рукою духа хрысьцянскае любові. Пашлі нам еднасьць у веры, згоду й паразуменьне ў сямейным і грамадзкім жыцьці. Загаі нашыя асабістыя й народныя раны душы, якія мы самі сабе спрычынілі, або ад непрыяцеляў атрымалі.

У нашым штодзённым жыцьцю, у працы, змаганьню й спакусах асьвяці наш розум Тваім евангельскім сьвятлом, каб выконваючы запаведы Твае, перамаглі ўсякія цяжкасьці й цярпеньні, заўсёды былі з Табою, заўсёды Цябе дабраславілі. Пашлі народу Беларускаму сьвятых і вялікіх слугаў Сваіх, якія справядлівым, пабожным і мудрым жыцьцём і дзейнасьцю вялі-б на

род наш да лепшае, сьветлае долі. Дай нам сьвятое нашае духавенства. Дабраслаў нашыя сем'і, каб у кожнай зь іх дбалы бацька й ахвярная маці, злучаныя Тваёю Божаю любоўю, гадавалі Табе на славу, а бацькаўшчыне на карысьць дзеткі свае. Асаблівую ласку Сваю пашлі нашай моладзі, каб у душах і сэрцах яе зьзялі цноты хрысьцянскія, каб яна расла на верных і карысных сыноў і дачок народу свайго.

Ты Сам, Госпаду, сказаў:"Прасеце, і будзе вам дадзена", мы молім Цябе Госпаду, памажы нам. Спасі, Госпаду, пашлі ласку Сваю на народ наш, і дай яму трывалы супакой.

Дабраслаў нашыя дачасныя дастаткі. Ня дай марна гінуць разумным, якіх Ты пасылаеш у наш народ, але памажы

ім свабодна разьвівацца й красавацць Табе на славу, а нам і ўсяму людзтву на карысьць. Дабраслаў працу сялянства, і працу работнікаў, настаўнікаў, мастакоў, вучоных, каб празь іх народ наш Беларускі мог разумна й добра жыць, і Цябе, Айца нашага Нябеснага, славіць.

І Цябе, Прасьвятая, Прачыстая, Нябесная Маці нашая, Багародзіца, просім: заступіся за нас перад пасадам Сына Твайго, Бога нашага, ахіні цудоўным пакровам Сваім верны Табе народ наш Беларускі. І Ты, сьвятая й слаўная Еўпрасіньня Полацкая, Апякунка Беларусі, харашыня й веліч духа нашага на Небе, і Ты, сьвяты Кірыле, нашыя ангельскія вусны ў Нябёсах, ды ўсе сьвятыя заступнікі народу Беларускага, малецеся за нас і апякуйцеся намі, каб мы сталі народам сьвятым, мілым Госпаду Богу, каб мы заўсёды добра выконвалі волю й запаведы Яго, сваё пасланства асягнулі, супакойнае й радаснае жыцьцё тут на зямлі і ат-

рымалі вечнае шчасьце на Небе, і Табе, Спрадвечнаму Ўладару й Богу нашаму, у Сьвятой Тройцы Адзінаму: Богу Айцу, Богу Сыну, і Богу Духу Сьвятому, прыносілі вернасьць, падзяку, любоў і славу, цяпер і заўсёды, і навекі вечныя. Амін.

МАГУТНЫ БОЖА

Магутны Божа! Уладар Сусьветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых.
Над Беларусяй ціхай і ветлай,
Рассып праменьні Свае хвалы.

Дай спор у працы штодзённай шэрай,
На лусту хлеба, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць дай.

Дай ўрадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш Народ.

У САДУ ГЭЎСІМАНСКІМ

МАЛІТВА ХВОРАГА

Госпаду Божа, Уладару жыцьця майго! Ты з ласкі свае сказаў: "Не хачу сьмерці грэшніка", але каб пазнаў Цябе, і жывы быў. Я ведаю, што гэтая хвароба, якая прыносіць цярпеньні мне, ёсьць караю Тваёю за грахі й правіны мае. Я знаю, што па ўчынках маіх заслужыў гэтую Тваю справядлівую заплату. Але, людалюбівы Госпаду, будзь міласьцівы мне грэшнаму: судзі мяне ня подле ліхіх учынкаў маіх а паводле бязьмежнага міласэрдзя Тваяго. Не пасылай сьмерці на мяне, але дай мне сілы, каб я цярпліва перанёс гэтую хваробу сваю, як заслужанае мною выпрабаваньне, і па ачуняньні ад яе, каб зьвярнуўся ўсім сэрцам, усёю душою, і ўсім разуменьнем маім да Цябе, Госпада Бога, Творцы майго, і жыў дзеля выпаўненьня запаведаў

Тваіх сьвятых на славу Табе, на радасьць маіх родных, і на маё дабро. Амін.

МАЛІТВА АБ ВЫЗДАРАЎЛЕНЬНІ ХВОРАГА

О, Найміласэрны Божа: Войча, Сыне, і Духу Сьвяты, у непадзельнай Тройцы адзіны, годны хвалы й славы! Глянь з ласкі Свае на слугу Твайго(*імя*) хворага! Даруй яму грахі й правіны ягоныя, вызвалі ад хваробы, зьвярні яму здароўе й сілы. Пашлі яму даўгое й супакойнае жыцьцё, абдары яго ўсякім Тваім Боскім дабром, каб ён разам з намі чыніў малітвы падзякі Табе, шчодраму Богу й Творцы нашаму.

Прасьвятая Багародзіца, усемагутным заступніцтвам Тваім памажы мне ў гэтай малітве маёй упрасіць у Сына Твайго, Бога майго, ачуняньня слугі Божага(*імя*).

Усе Ангелы Госпадавы, і ўсе сьвятыя, малеце Бога аб выздараўленьне слугі Ягонага(*імя*).

МАЛІТВА ЦЯЖАРНАЕ

О, Найслаўнейшая Маці Божая! Памілуй мяне, служку Тваю: прыйдзі мне на помач у маім цяперашнім палажэньню, і ў тых небясьпечнасьцях, сярод якіх родзяць дзяцей усе бедныя дачкі Евы. Успомні, о, Багаслауленая сярод жанчын, зь якою радасьцю й любоўю Ты сьпяшыла наведаць Сваю сваячку Элізавету ў часе яе цяжку, і як цудоўна падзеялі Твае ласкіпоўныя адведзіны як на маці, так і на дзіцянятка. У бясконцай дабраце Тваёй памажы й мне, пакорнай служцы Тваёй, у супакою й радасьці нарадзіць дзіцятка. Падаруй і мяне гэтаю Тваёю ласкаю, каб дзіцянятка ўва ўлоньню маім адчуўшы яе, так-

сама радасна ўзварушылася, падобна да сьвятога дзіцянятка Іёана, і пакланілася Госпаду Богу й Спасу нашаму, Каторы зь любові да нас грэшных не палічыў Сабе паніжэньнем Самому стаць дзіцяткам. Нявымоўная радасьць, якою напоўніла сэрца Тваё, Дзева, калі Ты глянула на нованароджанага Твайго Сына й Госпада, няхай асалодзіць мае цярпеньні ў часе нараджэньня майго дзіцятка. Жыцьцё сьвету, Спас мой, народжаны Табою, няхай збавіць мяне ад цярпеньня, што здараецца сярод мацярок у часе радоў, і няхай залічыць Ён плод улоньня майго да ліку абраных Богам.

Выслухай, Найсьвятшая Заступніца, Валадарка Нябесная, гэтую пакорную малітву маю, і глянь на мяне грэшную вокам ласкі Свае. Не засаром мае надзеі на Тваё вя-

лікае міласэрдзе, і ахіні мяне пакровам Тваім. Памочніца хрысьцян, лекарка хворых, памажы мне, каб і я пазнала на сабе, што Ты – Маці міласэрдзя, і каб я заўсёды ўслаўляла Тваю дабрату, якая заўсёды прыймае малітвы тых, што церпяць і сьпяшаюцца да Цябе з просьбамі ў сваіх бедах і хваробах.

Амін.

ТРАПАРЫ на 8 СЬПЕВАЎ(галасоў)

Сьпеў 1

Камяням запячатаны праз Юдэяў і воямі сьцярогшымі Чыстае Цела Твaё, уваскрос аднак у трэйці дзень, Спасе, даючы людзтву жыцьцё. Дзеля гэтага сілы нябесныя пяюць Табе Жыцьцядальніку: слава Ўваскрашэньню Твайму, Хрысьце, слава Гаспадарству Твайму, слава провіду Твайму, адзіна Людалюбча.

Сьпеў 2

Калі зышоў быў к сьмерці жывы Несьмяротны, тады пекла забіў зьзяньнем баства. Калі-жа й памершых з прадоньня ўваскрасіў быў, усе сілы нябесныя гукалі: Жыцьцядальніку, Хрысьце Божа наш, слава Табе.

Сьпеў 3

Хай весяляцца нябесныя, хай радуюцца зямныя: гэтак стварыў гаспадарства рукою Сваёю Госпад змогшы сьмерцяю сьмерць, першым сярод мёртвых быў, із пекла вызваліў нас, і даў людзтву важную міласьць.

Сьпеў 4

Сьветлую ўваскрашэньня казань ад Ангела даведаліся Госпадавы вучаніцы і прадзедаў засуджаньне скінута, Апосталам хвалячыся гукалі: апракінуў сьмерць, уваскрос Хрыстос Бог даючы людзтву важную міласьць.

Сьпеў 5

Суадвечнае Слова Айцу й Духу, із Дзевы радзіўся на спасеньне наша, пяём верныя і паклонімся: дображадаў бо целам узыйсьці на крыж і сьмерць працярпець і ўваскрасіць памершыя слаўным Уваскрашэньнем Сваім.

Сьпеў 6

Ангельскія сілы на гробе Тваім, а сьцярогшыя тут амярцьвелі, і стаяла Марыя ля гробу, шукала Чысьцейшага Цела Твайго. Зьняволіў пекла, не спакусіўся праз яго, наведаў Дзеву даруючы жыцьцё, уваскрос із мертвых, Госпаду, слава Табе.

Сьпеў 7

Разваліў Крыжам Тваім сьмерць, адчыніў праступніку рай, міраносіцаў плач стрымаў і Апосталам навучаць загадаў, Хрысьце Божа, і даў людзтву важную міласьць.

Сьпеў 8

З высаты зышоў Добры нутром, пахаваньне прыняў трыдзённае ды нас вызваліў ад цярпеньняў, Жыцьцё й Уваскрашэньне нашае, Госпаду слава Табе.

ТРАПАРЫ 12 СЬВЯТАЎ

РАСТВО ХРЫСТОВАЕ(сьпеў 4)

Раство Тваё, Хрысьце Божа наш, зазьзяла людзтву сьвятло розуму: праз яго зоркам служачы зоркаю навучаны, Табе кланяціся сонцу праўды й Цябе зьведаць з далі ўсходу, Госпаду слава Табе.

КАНДАК(сьпеў 3)

Дзева сяньня Прадыснуючага родзіць і зямля вярцеп Няпрыступнаму падаець, ангелы з пастухамі славасловяць, валхвы за зоркаю падарожнічаюць: дзеля нас радзілася Хлапчанятка, прадвечны Бог.

ХРОСТ ГОСПАДАЎ – Вадохрышча (сьпеў 1)

У Ярдане калі Ты хрысьціўся, Госпаду, Тройцы выявілася сьвет-

чаньне: бацькаўскі бо голас сьветчыў аб Табе называючы Цябе Найлюбшым сынам, а Дух у стані голуба абвесьціў сказанаму пацьверджаньне. Зьяўляйся Хрысьце Божа й людзтва асьвячай, слава Табе.

СПАТКАНЬНЕ ГОСПАДАВА (сьпеў 4)

Радуйся Дабрадатная Багародзіца Дзева, із Цябе бо зазьзяла сонца праўды Хрыстос Бог наш, які асьвячае сутных у цемры: весяліся й старча праведны, прымаючы на рукі Вызвольніка душ нашых, што падае нам уваскрашэньне.

ДАБРАВЕШЧАНЬНЕ (сьпеў 4)

Сяньня чало нашага спасеньня й з прадвечнага Тайнства выяўленьне, Сын Божы сынам Дзевы становіцца, і Гаўрыіл дабрату дабравесьціць. Таму і мы зь ім запяём

Багародзіцы: радуйся Дабрадатная Госпад з Табою!

ВЕРБНІЦА(сьпеў 1)

Агульнае ўваскрашэньне перад Тваймі мукамі прыракаючы, падняў зь мёртвых Лазара Хрысьце Божа. Таму і мы, як юнакі, нясучы азнакі перамогі, Табе, Пераможцу сьмерці, запяём: Гасанна ў вышшу! Дабраслаўлены, што йдзе ў імя Госпадава!

УШЭСЬЦЕ – УЗНЯСЕНЬНЕ(сьпеў 4)

Ты ўзьнёсься ў славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваў вучняў прарачэньням Сьвятога Духа абвешчаным ім папярэднім дабраслаўленьнем: Ты бо ёсьць Сын Божы Вызвольнік сьвету.

СЁМУХА(сьпеў 8)

Дабраслаўлены Ты, Хрысьце Божа наш, што мудрымі рыбакоў выявіў, паслаўшы ім Сьвятога Духа, ды тымі злавіў сусьвет, Людалюбча слава Табе.

АДМЯНЕНЬНЕ ГОСПАДАВА(сьпеў 7)

Адмяніўся Ты на гары, Хрысьце Божа, паказаў вучням Сваім славу Тваю бо можаш.Хай засьвеціць нам грэшным сьвет Твой прадвечны, малітвамі Багародзіцы Сьвятладальніку, слава Табе.

УСЬПЕНЬНЕ БАГАРОДЗІЦЫ (сьпеў І)

У растве дзеўства захавала Ты, ва ўсьпеньні сьвету ня пакінула Ты Багародзіца: перанеслася к жыцьцю Маці запраўднага Жыцьця і малітвамі Тваймі вызваляй ад сьмерці душы нашыя.

РАСТВО БАГАРОДЗІЦЫ(сьпеў 4)

Раство Тваё, Багародзіца Дзева, радасьць абвесьціла ўсяму сьвету, бо з Цябе зазьзяла сонца праўды: Хрыстос Бог наш і разьняў праклён, даў дабраслаўленьне й зьнішчыў сьмерць, падаў нам жыцьцё вечнае.

УЗЬДЗЬВІЖАНЬНЕ КРЫЖА(сьпеў 1)

Спасі Госпаду, людзей Сваіх, і дабраслаў багацьце Тваё, перамогу над супраціўнымі нам даруй і Сваім Крыжам барані Сваё жыхарства.

УХОД У СЬВЯТЫНЮ БАГАРОДЗІЦЫ (сьпеў 4)

Сяньня дабражаданьня Божага першавыяўленьне, і людзей спасеньня прадказаньне, у сьвятыню Божу Вечна Дзева яўляецца, і Хрыста

ўсім першавяшчае. Тое й мы голасна запяём: радуйся апекі Божае выкананьне.

НОВЫ ГОД – каляндарны (сьпеў 2)

Усякага твору Ўдзельніку, часы й годы ў Сваёй уладзе што ўлажыў, дабраслаў пачын году дабраты Свае, Госпаду ахавай у міры старонку нашу й места Своё, малітвамі Багародзіцы, і спасі нас.

ПАКРОВЫ (сьпеў 4)

Сяньня добрыя людзі сьветла сьвяткуем аслоненыя Тваім Багамаці прыходам і на Твой гледзячы ясны воблік, пабожна клічам: пакрый нас чыстым Тваім пакровам і збаў нас ад усякага зла, молячы Сына Твайго, Хрыста Бога нашага, спасі душы нашы.

ВЯЛІКДЗЕНЬ

Хрыстос уваскрос ізь мёртвых, сьмерцю сьмерць парваў і сутным у грабох жыцьцё ўсім даў. І нам даравàў жыцьцё вечнае, пакланяемся Яго трыдзеннаму ўваскрашэньню.

• • •

ВЯЛІКОДНАЕ СЛОВА
Сьв. ЁАНА ЗАЛАТАВУСНАГА

Калі хто цнатлівы й багалюбовы, няхай раскашуецца гэтай добрай і сьветлай урачыстасьцяй. Калі хто слуга разумны, няхай увойдзе з радасьцю ў радасьць Госпада свайго. Калі хто мацаваўся посьцячы, няхай прыйме сяньня плату. Калі хто ад першае гадзіны пасьціўся, няхай прыйме сяньня справядлівую заплату. Калі хто па трэйцяй гадзіне прыйшоў, няхай дзякуючы вясяліцца. Калі хто па шостай гадзіне, ані няхай не сумляецца, бо ў нічым не адхінаецца. Калі хто й дзявятую гадзіну прапусьціў, няхай прыступіць не сумляючыся, і не баючыся. Калі хто толькі ў адзінаццатую гадзіну зьявіўся, няхай не баіцца свайго спазьненьня.

Бо міласэрны Ўладыка: Ён прыймае апошняга так, як і першага: супакоіць і адзінаццатай гадзіне прыйшоўшага, як і працаваўшага ад першае гадзіны. Ён і апошняга мілуе, і першаму дага-

джае, і таму дае, і гэтага ўзнагараджае: і працу прыймае, і намер цалуе, учынкі славіць, і жаданьне хваліць. Таму ўвайдзеце ў радасьць Госпада свайго: і першыя, і другія, заплату прымеце багатыя й бедныя, адзін із адным весялецеся, цешцеся руплівыя й ляныя, дзень услаўляйце тыя, што посьціліся, і тыя, што ня посьціліся: усе ўзьвесялецеся сяньня! Чэсьць багатая, раскашуйцеся ўсе! Говедзь адкормлены, няхай ніхто не адыйдзе галодны: усе раскашуйцеся на чэсьць веры, усе ўспрымеце багацьце ласкаў. Няхай ніхто ня плача над сваёю беднотаю, бо ён удзельнік Боскага Валадарства. Няхай ніхто ня плача над грахамі сваймі, бо выбачэньне з гробу зазьзяла! Няхай ніхто не баіцца сьмерці, бо вызваліла нас ад яе Спасава сьмерць: Пагасіў яе Ён, каторы быў у моцы яе, перамог пекла, зыйшоўшы ў пекла, зьнішчыў яго, скаштаваўшы горыч яго. І гэта прадбачыў Ісайя: Пекла, кажа ён, зажурылася, пабачыўшы Цябе. Зажурыла-

ся, бо разваліласяǃ Зажурылася, бо Ты зьдзекі прыняўǃ Зажурылася, бо зьвязалася, прыняўшы Цела, Богу скарылася, прыняло зямлю, а спаткала Небаǃ Прыняло, што бачыла, і паддалося таму, чаго ня бачыла. Сьмерцьǃ Дзе тваё джала? Пеклаǃ Дзе твая перамога? Хрыстос Уваскрос, і ты пераможанаеǃ Хрыстос Уваскрос, і ўпалі дэманыǃ Хрыстос Уваскрос, і радуюцца Ангелыǃ Хрыстос Уваскрос, і памерлых няма ў гробеǃ Хрыстос Уваскрос ізь мертвых, і стаўся Першым для ўсіх памерлых. І Яму слава, і ўлада, навекі вечныя. Амін.

СЬВЯТЫЯ ТАЙНСТВЫ

ТАЙНСТВА, гэта такое сьвяшчэннае дзеяньне, у часе якога Госпад Бог нявідома пасылае ласку й сілу Прасьвятога Духа таму, над кім гэтае сьвяшчэннае дзеяньне дзеецца. Сьвятыя Тайнствы ўстанавіў Сам Ісус Хрыстос, Сын Божы, Сваім хростам на Ярдане, Сваймі заклікамі да каяньня, Сваёю прысутнасьцю й цудам на вясельлю ў Кане Галілейскай, асабліва-ж Сваёю Тайнаю Вячэраю, і пераданьнем Боскае ўлады Свае сьвятым Апосталам дараваць грахі людзям. Сьвятыя Тайнствы, гэта тыя цудоўныя сяродкі, даныя нам Богам Сынам, якія дазваляюць кожнаму з нас стацца ўлюбнікам, сьвятым.

Сваймі малітвамі й добрымі ўчынкамі мы імкнемся да задзіночаньня з Богам. Але гэтага мы ня зможам сваймі сіламі. Таму Ісус Хрыстос, Спас наш устанавіў у Сваёй Царкве Сьвятыя Тайнствы, як помач нам у нашым дасканаленьні.

У Сьв. Тайнстве хросту мы, ласкаю Духа Сьвятога й вадою змываем зь сябе наш грэх першародны, і нараджаемся духова, каб стацца слугамі Ісуса Хрыста.

Таму, гэты вялікі дар Божы, на які мы яшчэ не заслужылі, але атрымалі ад Бога пры хросьце, маем бязупынна трымаць і разьвіваць сілаю свайго собскага духа. Мы маем множыць усе нашыя здатнасьці, якія мы атрымалі ад Господа Бога, Айца нашага Нябеснага. Але, ці мы запраўды іх памнажаем? Нажаль, мы памалу пачынаем грашыць, асабліва тады, калі ад родных і хросных бацькоў не атрымалі належнага хрысьцянскага ўзгадаваньня.

І грахі нашыя "вырастаюць вышэй галавы нашай", і ўратаваць сябе самі мы ўжо ня можам, як ня можам "выцягнуць сябе за валасы з вады". Аднак, для адчаю тут няма месца, бо гэта прадбачыў Спас наш у Сваім Сьв. Тайнстве КАЯНЬНЯ-СПОВЕДЗІ й Сьв. ПРЫЧАСЬЦЯ.

Ён, як Бог і Чалавек ведае ўсе цяжкасьці сямейнага жыцьця, ды вялікія абавязкі бацькоў пры ўзгадаваньню дзяцей сваіх. Ён прыйшоў з дапамогаю: Сьв. Тайнствам ШЛЮБУ-СУЖЭНСТВА, у якім дае Сваю адумысную ласку для пабожнага хрысьцянскага сямейнага жыцьця.

Цяжка хворы чалавек сьмерці спадзяецца, із страхам бачыць, як часта й дрэнна грашыў у жыцьці сваім, як зьняважаў Дабрату Божую. І тут Госпад Міласэрны сьпяшыць яму з дапамогаю: Сваім Сьв. Тайнствам АЛЕЯПАМАЗАНЬНЯ... У вапошнюю часіну праяўляе ласку Сваю, бо ўсім жадае спасьціся.

ВЫНЯТКІ З КАТАХІЗІСУ

Два галоўныя Запаведы Спаса нашага:

1. Любі Госпада Бога свайго ўсім сэрцам сваім, усёю душою сваёю, і ўсім разуменьнем сваім.

Гэта першы і галоўны Запавед, а другі падобны:

2. Любі бліжняга свайго, як самога сябе.

ДЗЕСЯЦЬ ЗАПАВЕДАЎ БОЖЫХ

1. Я ёсьць Госпад Бог твой, хай ня будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне.

2. Не рабі сабе куміра, ані чагось падобнага да таго, што на небе-гары, што на зямлі-нізу, што ў вадзе й пад зямлёю: не пакланяйся ім і ня служы ім.

3. Не кажы ймя Госпада Бога Твайго дарма.

4. Памятай дзень сыботні, яго сьвяткуй, шэсьць дзён працуй, зрабі ў іх усю работу сваю, а сёмы дзень, сыботу, пасьвяці Госпаду Богу твайму.

5. Сыці бацьку свайго й маці сваю, каб добра табе былю, і каб доўга жыў на зямлі.

6. Не забівай.

7. Ня чыні пералюбства.

8. Не крадзі.

9. Ня сьветчы зьменна на бліжняга свайго.

10. Не пажадай сабе нічога чужога, ані таго, што бліжняга твайго.

ВАЖНЕЙШЫЯ ПРАЎДЫ ВЕРЫ

1. Ёсьць адзін Бог, Каторы ўсё стварыў, і ўсім гаспадарыць.

2. Бог ёсьць Справядлівы Судзьдзя, Каторы за дабро ўзнагараджае, а за ліхае карае.

3. Бог ёсьць у трох асобах: Бог Айцец, Бог Сын, і Бог Дух Сьвяты, што завем адным імям: Сьвятая Тройца.

4. Сын Божы стаў чалавекам, памер на крыжы дзеля нашага спасеньня, уваскрос і ўзьнёсся на Неба.

5. Сьвяты Дух, Каторы паходзіць ад Айца, зышоў на Апосталаў, і адухаўляе Сьвятую Царкву.

6. Душа чалавека ёсьць несьмяротная.

7. Да спасеньня абавязкава патрэбныя: Божая ласка, Вера, і добрыя ўчынкі.

8. Па сьмерці чалавека душа ягоная ёсьць у стане адчуваньня вечнага шчасьця, або вечнага пракляцьця.

9. Царква, якую заснаваў Ісус Хрыстос на зямлі, і Галавою якое Ён зьяўляецца, ёсьць адзіная Сьвятая сьветная й Апостальская. Ён кіруе Ёю Духам Сваім Сьвятым праз япіскапаў і сьвятароў.

10. Усе Народныя Праваслаўныя Цэрквы, што непарушна вызнаюць догмы й каноны, складаюць Адну Сьвятую Сьветную Апостальскую Саборную Хрыстовую Царкву.

Беларуская Аўтакехвальная Праваслаўная Царква ёсьць часткаю Сьветнае Хрыстовае Царквы.

ЦАРКОЎНЫЯ ПРЫКАЗАНЬНІ

1. Сьвяткаваць устаноўленыя сьвяты.

2. У нядзелі й сьвяты пабожна прыняць удзел у службе Божай.

3. Датрымоўваць устаноўленыя пасты.

4. Штогоду няменш раз, у Вялікі Пост, спавядацца й прычашчацца.

5. Вясельляў ды йгрышчаў у забароненым часе не спраўляць.

ЦНОТЫ БОЖЫЯ

1. Вера.
2. Надзея.
3. Любоў.

ЦНОТЫ МАРАЛЬНЫЯ

1. Мудрасьць.
2. Справядлівасьць.
3. Мужнасьць.
4. Зьдзержлівасьць.

СЕМ ДОБРЫХ УЧЫНКАЎ ДЛЯ ДУШЫ БЛІЖНЯГА

1. Грэшніка паправіць.
2. Хто ня ўмее, навучыць.
3. Хто сумляецца, даць яму добрую раду.
4. Сумнага пацешыць.
5. Прыкрасьць цярпліва пераносіць.
6. Крыўды шчыра дараваць.
7. Маліцца за жывых і памерлых.

СЕМ ДОБРЫХ УЧЫНКАЎ ДЛЯ ЦЕЛА БЛІЖНЯГА

1. Галоднага накарміць.
2. Смагнучага напаіць.
3. Голага адзець.
4. Падарожнага гасьціць.
5. Хворага адведаць.
6. Вязьню спагадаць.
7. Памерлага пахаваць.

ГАЛОЎНЫЯ ЦНОТЫ Й ПРАЦІЎНЫЯ ІМ ГРАХІ

1. Пакора – Пыха.
2. Шчодрасьць – Прагавітасьць.
3. Саромлівасьць – Бессаромнасьць
4. Спагадлівасьць – Завіднасьць.
5. Мернасьць – Прагавітасьць(абжорства й п'янства)
6. Лагоднасьць – Гнеў.
7. Працавітасьць, руплівасьць у добрым – Гультайства, лянота.

ГРАХІ СУПРАЦЬ СЬВЯТОГА ДУХА

1. Неразьмерная надзея на Божае міласэрдзе.
2. Безнадзейнасьць на спасеньне, або адчай.
3. Непакорлівасьць Хрыстовай Навуцы, данай нам Духам Божым.
4. Завіднасьць бліжняму Божае ласкі.
5. Закамянеласьць у грахох.
6. Адкладаньне каяньня аж да сьмерці.

ГРАХІ, ЯКІЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ БОЖУЮ ПОМСТУ

1. Забойства.
2. Статкалоства.
3. Крыўджаньне ўдоваў і сіротаў.
4. Стрыманьне заплаты работніку.

ПЯЦЬ УМОВАЎ ДОБРАЕ СПОВЕДЗІ

1. Улік сумленьня.
2. Жаль за грахі.
3. Пастаноў папраўіцца.
4. Споведзь.
5. Адбыцьцё пакуты.

ЧУЖЫЯ ГРАХІ З НАШАЕ ВІНЫ

1. Надзіць да грэху.
2. Намаўляць да грэху.
3. Загадваць, раіць грашыць.
4. Дазваляць грашыць.
5. Таіць грэх.
6. Памагаць да грэху.
7. Хваліць грэх.
8. Не караць грэху.
9. Бараніць грэх.

СЕМ СЬВЯТЫХ ТАЙНСТВАЎ

1. Хрост.
2. Мірапамазаньне.
3. Споведзь.
4. Прычасьце(Найсьвяцейшая Еўхарыстыя).
5. Сьвятарства.
6. Шлюб.
7. Алеепамазаньне.

КАРОТКІ ЦАРКОЎНЫ СЛОЎНІК

АЛІЛУЯ – габрайскае: хвалеце Госпада Бога.

АМІН – габр.: станься, хай будзе так, канец малітвы.

АПОСТАЛ – грэцкае: пасланец.
1. Хрыстоў вучань – пасьлядоўнік.
2. Кніга запісу апостальскіх лістоў.
3. Чытаньне апостальскіх лістоў.

АРХІПАСТЫР – грэц. і славянскае: старэйшы пастух, назоў япіскапа.

АРХІЯПІСКАП – грэц.: старэйшы япіскап, назоў ступені япіскапа.

АРЫСТРАЦІГ – грэц.: старшы ваявода, назоў анг. Міхаіла, ваяводы нябеснага.

АЛТАР – габр.: частка царквы, выдзеленая для сьвятога служэньня.

БАГАВЕДА – вывучаньне нярэчыўных, Боскіх зьяваў.

БДЗЕНЬНЕ – слав.: бязсоннае трываньне, бязупыннае маленьне, праз усю ноч маленьне, ці багаслужба.

БЛІЖНІ – слав.: прыяцель, сусед, чалавек-брат.

ВЯЧЭРНЯ – слав.: багаслужба, чыненая вечарам. Ёсьць: малая, вялікая, усядзённая, вялікапосная.

ГОСПАД – слав.: спадар, у адношаньні да Бога, найчасьцей Бога Сына.

ЖЭРАБ – слав.: костка-кубік, азначаны для граньня ў косьці.

2. Выбіраньне без разглядданьня, на сьлепа.

ЗАПАВЕД – слав.: загад, Божы загад, закон.

ДОГМА – грэц.: пэўная, непадлягаючая сумненьню думка, праўда.

ДЫЯКАН – грэц.: прыслужнік,

2. Першая ступень сьвятарства.

ДЗЯК – маскоўскае:

1. Урадавец.

2. Сьпявар, кіраўнік хору ў абзывальным кліканьні.

ЕКЦЕНІЯ – грэц.: прадоўжаньне. У царкве значыць доўгае, просячае маленьне. Па кожнай просьбе вернікі сьпяваюць "Госпаду памілуй" або "Падай Госпаду", або "Табе Госпаду".

ІКОНА – грэц.:
1. Малюнак асобы.
2. Абраз сьвятое асобы.
Малюнкі асобаў ніколі ня жыўшых у целе, як Бога Айца, Сьв. Духа, анге-лаў, ня ёсьць іконы, а выабражэньні мастака.

ІКАНАСТАС – грэц.:
1. Састаўленьне іконаў.
2. Сьцяна з іконаў, што аддзяляе ал-тар ад царквы. Мае заўсёды трое дзьвя-рэй, ікону Багамацеры на левым, ды Ісуса Хрыста на правым баку галоўных дзьвярэй. На левых дзьвярах малюнак арханг. Міхаіла, а на правых арханг. Гаўрыіла.

КАНОН – грэц.:
1. Закон, распараджаньне.
2. Царкоўны закон, парадак дзейнасьці.

КАНАНІЧНЫ – грэц.:
1. Царкоўна правільны.
2. Царкоўна важны.

КАНДАК – грэц.:
1. Хатка-будка.
2. Назоў кар[illegible]ай песьні ў дзень сьвя-та, ці ўспамінанае ў той дзень асобы.

КЕХВАЛЬНЫ – грэц.: кіравецтва, галава. АЎТАКЕХВАЛЬНЫ – самакіручы, незалежны.

КАТАХІЗІС – грэц.: збор запаведаў, догмаў, канонаў веры й Царквы.

КРЫВАДУШНЫ – слав.: ашуканчы, ілжывы.

ЛІЦІЯ – грэц.: агульнае маленьне з удзелам усіх вернікаў у царкве.

ЛІТУРГІЯ – грэц.: агульная багаслужба. Галоўная багаслужба.

ЛІТУРГІЧНЫ – грэц.: прыналежны да багаслужбы. Рэчы патрэбныя й карыстаныя ў час усіх багаслужбаў, такжа мова, сьпеў, музыкальныя струманты званы, – а калісь у жыдоў цымбалы, трубы, гонгі.
– Багаслужэбны.

ЛІТАНІЯ – грэц.: агульнае прашэньне, тое, што Екценія ў сучасным разуменьні.

МІРА – габр.:
1. Пахучы алей.
2. Адумысна пасьвечаны алей для Сьв. Тайнства памазаньня:

МІРАНОСІЦА – слав.: жанчына, што несла алей для пахавальнага рыхтаваньня цела.

МАЛЕБЕН – слав.: багаслужба дзеля адумыснай прашэльнай, ці хвальнай патрэбы.

МУЧАНІК – слав.: пацярпеўшы сьмерць за веру. Прападобнамучанік – манах мучанік.

МІТРАПАЛІТ – грэц.: ступень сьвятарства. Япіскап, пастаўлены над япіскапамі.

МЫТАР – слав.:

1. Зьбіральнік мыта, аблогі.
2. Зьдзірац, шкурадзёр, дзелятаго, што ў старыну мыта ня было азначанае й мытары забіралі колькі маглі.
3. У царкве разумеецца, як чалавек, які ведае, што ён вельмі грэшны й каецца ў грахох.

НЯДЗЕЛЯ – слав.: дзень нічога не рабіць, непадзельны дзень тыдня. У гэтым дню тыдня Хрыстос уваскрос і таму лічыцца днём сьвята, намест сыботы, запаведанай Богам сьвяткаваць, як "сёмы дзень. Госпаду Богу свайму"

ПАНІХІДА – грэц.: усё маленьне аб памёршых. Памінальная багаслужба.

ПАТРЫЯРХ – грэц.: бацька япіскапаў. Ступень сьвятарства, найвышэйшая сярод япіскапаў.

ПАМІНАНЬНЕ – слав.: успамін памёршых у маленьні. Хаўтурнае чыненьне.

ПЛАШЧАНІЦА – слав.: пакрыўка на труну. Літургічная-багаслужэбная пакрыўка, карыстаная на Гроб у Вялікую Пятніцу.

ПРАПАДОБНЫ – слав.: вельмі падобны да Хрыста. Азначэньне манаха, ці сьвятара.

ПРАСЬВЯЧЭННЫ – слав.: даўно, вельмі асьвечаны. Назоў япіскапа.

ПРАСЬВІЦЕР – грэц.: стары сьвятар. Ступень сьвятарства, цяпер мала карыстаная.

ПРАТАЯРЭЙ – грэц.: вышэйшы сьвятар. Найвышэйшая сьвятарская ступень.

ПРАСКАМІДЗЯ – грэц.: прыношаньне. Пачаткава частка літургіі, калі сьвятар рыхтуе хлеб і віно для багаслужбы.

ПРАКІМЕН – грэц.: пастаўлены наперад. Сказ з псальмаў, прагалошваны перад чытаньнем апостала.

ПСАЛЬМ – габр.: песьня. Пабожныя песьні Старога Закону, у бальшыні цара Давыда.

ПСАЛТЫР – габр.: кніга песьняў, псальмаў.

САБОР – слав.: сход людзей.

Сабор Япіскапаў – паседжаньне ўсіх япіскапаў Царквы.

Япархіяльны Сабор – зьезд царкоўнікаў япархіі.

Сьветны Сабор – нарада ўсіх япіскапаў сьвету.

Сабор – царква, у якой гаспадарыць япіскап.

САН – татарскае: сьцёны. Ступень пашаны, улады, грамадзкага становішча.

СЬВЯЦІЦЕЛЬ – слав.: япіскап, прызнаны сьвятым. Сьв. Мікалай.

СПОВЯДЗЬ – слав.: пабожнае выказаньне грахоў. Сьв. Тайнства споведзі.

СІЁН – габр.: гара ў Ізраілю, на якой была маемасьць цара Давыда. Спадчына цара Давыда. Пабожны народ Давыда.

СІМВАЛ – грэц.: знак, сыпіс знакаў. Сьв. Веры, або Веру, або Крэда – песьня-малітва із саборных выясьненьняў Хрыстовай Веры й Царквы.

ТРАПАР – грэц.: кароткая песьня. Песьня сьвята, якая падае зьмест сьвята.

УВАСКРАШЭНЬНЕ – слав.: ажыўленьне мёртвага. Паўстаньне зь мёртвых Хрыста.

УГОДНІК – слав.: вернік, заслужаны ў Бога, сьцёны манах, ступень сьвятасьці.

УЛАДАР – слав.:

1. Гаспадар, цар, пан, уласьнік.

2. Бог.

УЛАДЫКА – слав.: гаспадар. Назоў япіскапа.

УЛАДАРСТВА – слав.:

1. Гаспадарства, дзяржава.

2. Неба, дзе жывуць Бог, сьвятыя й заслужаныя па іх сьмерці.

ХЕРУВІМСКАЯ ПЕСЬНЯ – сьпяваная ў пачатку галоўнай часткі літургіі.

ЦАРКВА – слав.: сьвятыня. Будынак, пасьвечаны на багаслужбы. Аб'еднаньне вернікаў пад япіскапскім павадырства. Агульнае разуменьне рэлігійнага.

ЦЕЛАПАЛЕНЬНЕ – слав.: прыношаньне крывавага аброку-ахвяры праз спальваньне жывёлы.

ЧАС – слав.: чытань з трох псальмаў і штодзённых малітваў, уложаных паводля гадзін дня : *Першы час* а 6-ай раніцы. *Трэйці час* – а 12 дня. *Шосты час* – а 6-ай вечарам. *Чацьверты час* – а 12 ноччу. Таму ў час праскамідзі звычна чытаць Час Трэйці(перад літургіяй).

ЯПІСКАП – грэц.(епіскопс), над сьвятарамі. Апостальская ступень сьвятарства.

З Ь М Е С Т :

АБ МАЛІТВЕ 1
РАНІЧНЫЯ МАЛІТВЫ 8
Малітва да Сьвятога Духа 9
Трысьвятое 9
Малітва да Прасьвятое Тройцы 10
Малітва Госпадава 11
Ранічныя Трапары 12
Малітва да Сьвятое Тройцы 13
Малітва Сьв. Макара Вялікага 14
Другая малітва Сьв. Макара Вялікага.......... 15
Малітва да Ангела Ахоўніка рана 16
Слаўленьне Прасьвятое Багародзіцы 17
Трапар Крыжа за Бацькаўшчыну 18
Малітва хвалы да Прасьвятое
Багародзіцы 18
Сымбаль Праваслаўнае Веры 19
Псальм 50(каяльны) 21
Малітва за жывых 23
Малітва за памерлых 25
Малітва да свайго Сьв. Іменьніка 26
МАЛІТВЫ НА ПРАЦЯГУ ДНЯ
Малітва перад пачаткам усякае працы 27
Малітва перад навукаю 28
Малітва пасьля навукі 29
Малітва перад ядою 30
Малітва пасьля яды 30

МАЛІТВЫ ПЕРАД СНОМ 31
Трапары Вячэрнія 32
Малітва даравання грахоў 33
Малітва Сьв. Макара Вялікага 34
Малітва Сьв. Анціёха 35
Малітва да Прасьвятое Багародзіцы 36
Малітва да Ангела Ахоўніка вечарам 37
Малітва да Прасьвятое Багародзіцы 38
Малітва Сьв. Яньнікія 39
РОЗНЫЯ МАЛІТВЫ ....
Малітва супраць злога 41
Малітва каяньня й нашых просьбаў да Госпада 42
Малітва перад споведзьдзю 44
Малітва каяньня 45
Малітва перад Сьв. Прычасьцем 46
Малітва перад самым Сьв. Прычасьцем 47
Малітва пасьля Сьв. Прычасьця 49
Малітва Сьв. Васіля Вялікага пасьля Прычасьця 51
Малітва падзякі Сьв. Амброзія 52
Малітва да Жыровіцкае Багамаці 55
Малітва да Сьв. Еўпрасіньні 56
Малітва да Сьв. Кірылы Тураўскага 59
Малітва 60
Магутны Божа*(песьня)* 64
Малітва хворага 66
Малітва аб выздараўленьні хворага 67

Малітва цяжарнае **68**
ТРАПАРЫ НА 8 сьпеваў(галасоў) **71**
ТРАПАРЫ 12 СЬВЯТАЎ **75**
Вялікоднае Слова Сьв. Ёана Залатавуснага 82
СЬВЯТЫЯ ТАЙНСТВЫ 85
ВЫНЯТКІ З КАТАХІЗІСУ 88
Дзесяць Запаведаў Божых 88
Важнейшыя Праўды Веры 90
Царкоўныя Прыказаньні 92
Цноты Божыя 92
Цноты маральныя 93
Сем добрых учынкаў для душы бліжняга 93
Сем добрых учынкаў для цела бліжняга 94
Галоўныя цноты й праціўныя ім грахі 94
Грахі супраць Сьв. Духа 95
Грахі, якія выклікаюць Божую помсту 95
Чужыя грахі з нашае віны 96
Пяць умоваў добрае споведзі 96
Сем сьвятых тайнстваў 97
КАРОТКІ ЦАРКОЎНЫ СЛОЎНІК 98

Выданьне сфінансавала
Беларускае Аб’яднаньне
Студэнтаў
БАС